

ШТО ШУКАЮЦЬ НА ВОСТРАВЕ КЛЯШТАР?

5

ПАКЛАПАЦІЦЦА, КАБ ЖЫЦЬ ПРЫГОЖА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЛІПЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 139 (29006)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Артур КАРПОВІЧ, першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю спецыяльна створанай групай падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы, які прадугледжвае карэкціроўку Указа № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Сярод асноўных новаўвядзенняў — падаўжэнне да канца 2030 года перыяду прадстаўлення льгот і прэферэнцый. Таксама праект дакумента прадугледжвае ўсталяванне асобнага ільготнага тарыфу на электраэнергію для рознічных гандлёвых аб'ектаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, размешчаных на вёсцы».*

# «ТУТ ЖЫЦЬ МОЖНА, ТУТ ЖЫЦЬ ТРЭБА»

## Учора Аляксандр Лукашэнка здзейсніў візіт на Гомельшчыну, які анансаваў на нядаўняй селектарнай нарадзе па ходзе ўборачнай кампаніі

**Паўднёва-ўсходні рэгіён падчас дыстанцыйнай гутаркі з губернатарамі выклікаў заклапочанасць у кіраўніка дзяржавы: тут асабліва не пашанцавала з надвор'ем. З'явіліся ў Прэзідэнта пытанні і па структуры пасеваў, а таксама па кадравай палітыцы.**

Аляксандр Лукашэнка абраў для візіту Веткаўскі раён — адну з самых самабытных і прыгожых мясцін Беларусі, якая, на жаль, пацярпела ад чарнобыльскай аварыі.

Былі ўзнятыя многія праблемныя пытанні, але, напэўна, галоўным вынікам візіту стала кароткая сустрэча Прэзідэнта з жыхарамі райцэнтра, якія сардэчна падзякавалі за ўвагу кіраўніцтва краіны да сябе.

«Вы мне не дзякуйце, гэта я вам павінен падзякаваць за тое, што вы гадоў дваццаць-трыццаць таму паверылі мне і тут засталіся! — сказаў ён людзям. — Вы памятаеце, якая была сітуацыя ў Веткаўскім раёне?.. Я вам удзячны за тое, што вы заўсёды мяне падтрымлівалі. А сёння мы бачым, што тут жыць можна, што тут жыць трэба, як бы ні было цяжка, бо на чужыне вам лягчэй не будзе».

СТАР. 2



Фота БелТА.



● У Гродзенскай вобласці звыш 40 экіпажаў камбайнераў намалацілі па тысячы і больш тон збожжа.

● **Дні культуры Егіпта пройдуць восенню ў Беларусі.**

● Беларусь падчас II Еўрапейскіх гульняў наведала, паводле папярэдніх падлікаў, каля 37,5 тысячы турыстаў.



● **У Баранавіцкім раёне работнікі выратавалі пры пажары 25 цялят.**

ISSN 1990 - 763X

Дэмаграфія

# КАБ БЕЛАРУСАЎ НЕ МЕНШАЛА...

**У нашай краіне пачынае зніжацца нараджальнасць, у той час як узровень смяротнасці застаецца стабільна высокі. Усё гэта — сведчанне неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі. Што думае рабіць дзяржава, каб колькасць беларусаў не памяншалася?**



Фота БелТА.

### Вырашэнне пытання з жыллём

«Сем'і ўсё часцей адкладаюць нараджэнне дзяцей на пазнейшы тэрмін», — кажа **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.** Маладыя людзі імкнуцца спачатку зрабіць кар'еру, дасягнуць матэрыяльнага дабрабыту і не спяшаюцца ствараць сям'ю. А калі і ствараюць, то часцей за ўсё не заключаюць афіцыйны шлюб, што таксама не спрыяе нараджальнасці. Але асноўная прычына, з якой сем'і адкладаюць нараджэнне дзяцей альбо прыняцце рашэння аб павелічэнні складу сям'і, паводле слоў спецыяліста, — жыллёвае пытанне.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

# РЫХТУЙ ЦЕПЛАТРАСЫ ЛЕТАМ

## Чым займаюцца сёння камунальшчыкі і энергетыкі

**Планавыя адключэнні вады, рамонт цепла- і электрасетак, замена газавых прыбораў і стратэгічны запас паліва. Пра гэтыя і іншыя моманты падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона расказалі спецыялісты ЖКГ, энергетыкі і газавай галіны.**

### ЦЕПЛАВЫЯ КІЛАМЕТРЫ

Штогадовая замена старых цепласетак ПІ-трубамі дазваляе не толькі зменшыць цепластраты і павысіць надзейнасць цеплазабеспячэння спажыўцоў, але і скарацiць тэрміны планавых адключэнняў гарачай вады для рамонтных работ. У Ваўкавыску, напрыклад, гарачую ваду адключаюць у сярэднім на 10 сутак, у Навагрудку — на тыдзень, а ў раёнах Слоніма, якія абслугоўваюцца жыллёва-камунальнымі службамі, — увогуле на 3-4 дні, падкрэсліў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства ЖКГ:**

*— Прыярытэтным кірункі ў падрыхтоўцы да ацяпляльнага сезона — іспыты, рэканструкцыя і рамонт цеплавых, водаправодных і каналізацыйных сетак, а таксама кацельнага абсталявання і жыллёвага фонду. Усе рэгламентныя работы скіраваны на павышэнне якасці паслуг па ацяпленні і гарачым водазабеспячэнні.*

СТАР. 4